*Маргарыта Прохар*

# МАСТАЦКАЕ ПЕРААСЭНСАВАННЕ ХРЫСЦІЯНСКАЙ І ФАЛЬКЛОРНАЙ ВОБРАЗНАСЦІ Ў ТВОРАХ ПРА ЧАРНОБЫЛЬ: І. ШАМЯКІН, В. КАЗЬКО, В. КАРАМАЗАЎ, УЛ. ЯВАРЫЎСКІ

Зварот да міфалогіі і фальклору ў «вясковай» прозе абумоўлены самімі рэаліямі і героямі з народа, які будаваў сваю жыццёвую прастору на аснове пэўных веравання пашырае кола вобразна-выяўленчых сродкаў для пісьменніка.

«Першабытныя формулы», г. зн. «архетыпы», пастаянна сустракаюцца ў творах класікаў, і, больш таго, існуе агульная тэндэнцыя да вяртання гэтых формул», – сцвярджае даследчык Н. Фрай [4, *16*]. Трэба адзначыць, што міфакрытыкі шмат зрабілі для даследавання «генезісу і тыпалагічных аспектаў» [3, *78*] літаратуры, аднак адметным і маладаследаваным застаўся міфалагічны беларуска-украінскі складнік твораў пра Чарнобыль. Як вядома, для пісьменнікаў міфалогія і фальклор з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай спазнання духоўнага жыцця народа, «адным з важнейшых сродкаў узбагачэння асабістай мастацкай творчасці элементамі народнай культуры, жанрава-стылявымі формамі» [1, *14*].

Эсхаталагічнасць чарнобыльскай сітуацыі прымусіла аўтараў пераглядзець звыклыя міфалагічныя і фальклорна-хрысціянскія вобразы і іх устойлівыя дадатныя сэнсы.

Адметна перададзенаператварэнне міфалагічных і фальклорна-хрысціянскіх вобразаў у аповесці В. Карамазава «Краем Белага шляху», якая стала трагедыйным працягам яго рамана «Пушча». Падзеі ў творы разгортваюцца ў час святкавання хрысціянскіх Пакравоў. Аднак гэта не фон і не дэкарацыя, а своеасаблівае напамінанне аб духоўнасці ў кантрасце разбуральнага часу і эпохі, адлюстраванне крызісу быцця. Кантрасным да святых Пакравоў з'яўляецца апісанне асаджэння радыяцыйнага бруду на Магілёўшчыну: «*У першыя дні мая восемьдзесят шостага года, (...) ноччу, пад раніцу, пачуліся выбухі, нібы над галовамі рваліся снарады ці ракеты. Пайшоў дождж, у вокны забарабаніў град, лёд з неба пасыпаўся буйны, як боб. А раніцай прыгрэла сонейка, і па вёсцы заблішчэлі сінія, з зялёнымі ды ружовымі беражкамі лужыны. Дзеці высыпалі на вуліцы голенькія, лезлі ў каляровыя лужыны і рагаталі, шчаслівыя. І толькі пазней вёска дачулася, што за шчасце разлілося ў яе пад вокнамі. Ліло з хмар, якія плылі з Чарнобыля на Маскву*» [2, *382*].

Хрысціянскія Пакровы – невыпадковы мастацкі сімвал у творы. Выкарыстоўваючы хрысціянскую і фальклорную сімвалічнасць, В. Карамазаў па-мастацку пераасэнсоўвае сімвалічныя вобразы Аброка і Белага шляху. У яго кнізе міфалагічнае ўспрыняцце спрадвечных вобразаў спалучаецца з наданнем ім містычнага каларыту прадвеснікаў бяды, эсхаталагічнага кірунку. І таму галоўны герой Валетаў настойліва шукае выйсця, хоць міфічнага, містычнага, падобнага да веры на збавенне, бо без

веры і надзеі працяг жыцця немагчымы. Такім выйсцем для яго з'яўляецца Крыж-Аброк. Гэты мастацкі вобраз – адзін з вызначальных у творы. Аброк процістаіць эсхаталагічнаму пачатку, «*вартуе вёску ад усіх, хто ў вёсцы, не распускае па свеце, са свету вяртае. Людзі яму прысягаюць у вернасці. Гэтак спрадвек. Людзі забыліся на Аброк. Яны яму здрадзілі. І растрэсліся вёскі*» [2, *71*] Мастацкі вобраз Крыжа-Аброка – сімвал надзеі на продкаў, уратавання ад Чарнобыля. Ён увасабляе традыцыйнае разуменне дабра, спрадвечнага і роднага, таму В. Карамазаў нездарма вяртае да яго сваіх герояў.

Забыццё на Аброчны крыж – пачатак разбурэння ў грамадстве, руйнавання прыроды, панавання смерці. Аброкам пазначаны наступствы Чарнобыля духоўнага і Чарнобыля матэрыяльнага, зямнога. Яркі сімвалізм аповесці працягвае і вобраз «Белага шляху» – гэта своеасаблівая далейшая распрацоўка і пашырэнне пісьменнікам вобраза «Аброчнага крыжа». Белы шлях – сімвал нябеснага, а з паняццем неба ў хрысціянскай традыцыі асацыіруецца чалавечая душа, духоўнасць народа ў цэлым. «*Валетаву здалося, што Белы шлях – гэта крыж, і не ляжаў ён, а стаяў над зямлёю*» [2, *126*].

Паэтыка Віктара Казько мае падкрэслена міфалагічны, фальклорны характар, што надае яго «чарнобыльскім» творам адвостраную трагедыйнасць і, як і ў В. Карамазава, служыць сродкам выражэння эсхаталагічных матываў. Аповесць «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» вызначаецца семантычнай інверсіяй добра вядомых носьбітаў станоўчых сэнсаў і асацыяцый. Так, напрыклад, сонца, зямля, буслы трансфармуюцца з нацыянальна светлых вобразаў-сімвалаў фальклорнай паэтыкі ў азначаныя чарнобыльскай мутацыяй эсхаталагічныя знакі бяды. І гэты семантычны пераварот найбольш яскрава перадае трагедыйнасць паслячарнобыльскага існавання.

Міфалагічныя і фальклорна-хрысціянскія вобразы у рамане І. Шамякіна «Злая зорка» набываюць глабальны характар праз суаднясенне з родам, сям'ёй. Пісьменнік закранае балючую тэму выратавання дзяцей, нашага будучага пакалення, беларускага генафонду, ад вынікаў чарнобыльскай катастрофы. Дзіця і анёл – дзве чыстыя, бязгрэшныя душы, і таму найбольш страшна, калі яны бязвінна пакутуюць. І. Шамякін трапна скарыстоўвае такое параўнанне для абвостранага ўспрыняцця трагедыі – цяпер ужо праз свядомасць дзяцей: «*Пасярод стаялі дзве шахтныя стойкі – падпіралі столь, - абвешаныя, як і калідоры, адзеннем, пераважна дзіцячым. Але не гэта ўразіла наведвальнікаў. Паміж стойкамі на вузлах сядзела мадонна з дзіцём на руках, паўтарагадовым хлопчыкам – анёлам, толькі што без крылаў. З бакоў да мамы туліліся яшчэ трое малых, дзве дзяўчынкі і хлопчык*» [5, *145*].

Многія вобразы, як і выяўленчыя сродкі іх стварэння, набываюць у І. Шамякіна іншыя акцэнты, нібы муціруюць, падобна ўсёй паслячарнобыльскай рэальнасці. Так, напрыклад, вобразу сонца надаецца трагедыйная семантыка: «*Сорамна яму было, што пакідае людзей, таму*

*чырванее... Але не ласкава-сарамлівым, як некалі, здалося яно, а злавесным, што вялікі пажар. А яшчэ чамусьці здалося, што сонца адарвалася ад неба, а зямля не прымае яго, і яно павісла. І гэтак будзе вісець. І не здолее ўзысці, страціўшы сілу*» [5, *188*]; «*садзілася сонца. Завалаквалася нейкай імжой і ад гэтага рабілася жоўтым*» [5, *185*].

У рамане ўкраінскага пісьменніка У. Яварыўскага «Марыя з палыном у канцы стагоддзя» найбольш акцэнтавана ў сваёй трагічнай сутнасці пададзены ключавы вобраз «Марыі з палыном», праз які перадаюцца душэўныя перажыванні роду, сям'і. Марыя Міровіч нядаўна пахавала мужа, а праз колькі дзён Чарнобыль забраў у яе і двух сыноў. У вобразе гэтай жанчыны сканцэнтравана ідэя нязгаснага і неперадаваемага болю – за зямлю, дзяцей, род. Яна – нібы адроджаны аўтарам біблейскі вобраз святой Марыі-пакутніцы, нібы знак – сімвал болю і пакут. Вобраз Марыі паўстае ў вачах яе дзяцей і ўнукаў як талісман роду і сваёй зямлі Яна па-свойму ўспрымае трагедыю на станцыі. Яе клопат – не за сябе. Яе клопат – за род: сваіх дзяцей і ўнукаў. Нездарма ў апісанне адчайнага роздуму Марыі, пошукаў выйсця аўтар уключае біблейскі вобраз свечкі: «*Марыя сядзіць за сталом перад запаленаю свечкаю, тварам да адчыненых дзвярэй. У падоле спадніцы, між каленямі, дрэмле краценя, з якім ужо звыклася і якога не брыдзіцца, пагладжвае яго рукою, невідушча ўтаропіўшыся вачыма ў агеньчык свечкі*» [6, *151*].

У вызначаных творах адчувальна пераасэнсаванне фальклорных і хрысціянскіх міфалагем. Новае вобразнае напаўненне. Гэтае пераасэнсаванне дапамагае пісьменнікам па-новаму, найбольш востра паказаць паслячарнобыльскую рэчаіснасць, наступствы бяды, разбурэнне трывалага народнага быту і духоўнага ўкладу. Новае вобразнае напаўненне біблейскіх цытат (пра Зорку Палын, трубны глас трэцяга анёла, інш.), узбуджэнне асацыятыўнага поля Маці Божая – Марыя, семантычныя акцэнты Пакравоў, Аброчнага крыжа, Белага Шляху, вобразаў свечкі, царквы, храма, д'ябла, апраметнай, змена фальклорных канатацый, традыцыйна ўласцівых зямлі, сонцу, небу, поўні, прыродным стыхіям (агню, ветру, вадзе, дажджу, туману, інш.), абумоўлены, на наш погляд, тэматыкай і праблематыкай твораў беларускіх і ўкраінскага пісьменнікаў, вельмі выразна засведчылі тыпалагічную агульнасць іх стылявых пошукаў, тэндэнцыю да выкарыстання ўмоўных форм выразнасці, спалучэння гістарычнага з быційна-міфалагічным.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Джанумов, С.* Традиции песенного и афористического фольклора в творчестве А. С. Пушкина / С. Джанумов. – М., 1998.

2. *Карамазаў, В.* Аброчны крыж / В. Карамазаў. – Мінск, 1994.

3. *Козлов, А.* Структурализм и мифологическое литературоведение США: проблемы взаимосвязи и интерпретации / А. Козлов // Тенденции в

литературоведении стран Западной Европы и Америки: литературно-критические статьи. – М., 1981.
4. *Фрай, Н.* Анатомия критики / Н. Фрай // Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв.: литературно-критические статьи. – М., 1987.
5. *Шамякін, І.* Злая зорка / І. Шамякін // І. Шамякін: збор твораў у 8 т. Т.6. – Мінск, 2005.
6. *Яварыўскі, Ул*. Марыя з палыном у канцы стагоддзя Ул. Яварыўскі. – Мінск, 1991.